Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ**

**ЦЭНТРАЛЬНАЯ НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Я. КОЛАСА**

**ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ СТАРАДРУКАЎ І РУКАПІСАЎ**

**АДДЗЕЛ ДАСЛЕДАВАННЯ РУКАПІСАЎ**

**ФОНД № 77**

# «БАРЫСЕНКА ВАСІЛЬ ВАСІЛЬЕВІЧ »

**ВОПІС № 1**

**Крайнія даты дакументаў вопісу:**

**[1944] – 1984 гг. і б/д**

**Колькасць адзінак захавання ў вопісу:**

**59 (пяцьдзясят дзевяць)**

**Дата складання вопісу: лістапад 2024 г.**

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# ЗМЕСТ
## да вопісу № 1 фонду № 77
## “Барысенка Васіль Васільевіч”


| Назва раздзелаў | № адз. зах. | № стар. |
|---|---|---|
| **1. Творчыя дакументы В.В. Барысенкі** | **1 – 3** | **1** |
| 1.1. Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук “Ф. Богушевич и проблема реализма в белорусской литературе XIX века” | 1 - 3 | 1 |
| **2. Дакументы службовай дзейнасці** | **4 – 7** | **2** |
| **3. Дакументы да біяграфіі В.В. Барысенкі** | **8 – 52** | **3 – 11** |
| 3.1. Дакументы аб святкаванні юбілеяў | 8 – 38 | 3 – 8 |
| 3.2. Іншыя дакументы да біяграфіі | 39 – 52 | 8 – 11 |
| **4. Выяўленчыя дакументы** | **53 – 55** | **11** |
| **5. Дакументы пра В.В. Барысенку** | **56 – 59** | **11 – 12** |


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# СХЕМА
## сістэматызацыі фонду № 77, вопіс № 1
## “Барысенка Васіль Васільевіч”

1. **Творчыя дакументы В.В. Барысенкі (1954)**
   1.1. “Ф. Богушевич и проблема реализма в белорусской литературе XIX века”. Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук.

2. **Дакументы службовай дзейнасці (1949)**

3. **Дакументы да біяграфіі В.В. Барысенкі (1945–1984)**
   3.1. Дакументы аб святкаванні юбілеяў (1964–1984)
   3.1.1. 60-годдзе з дня нараджэння (1964)
   3.1.2. 70 і 75-годдзе з дня нараджэння (1974, 1979)
   3.1.3. 80-годдзе з дня нараджэння (1984)
   3.2. Іншыя дакументы да біяграфіі (1945–1984)

4. **Выяўленчыя дакументы ([1944]–1970 і б/д)**

5. **Дакументы пра В.В. Барысенку (1974–1984)**

Навуковы супрацоўнік Т.І. Жук

лістапад 2024

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# ДАВЕДКА
## аб жыцці і дзейнасці В.В. Барысенкі

**Васíль Васíлевіч Барысéнка** – беларускі літаратуразнавец, крытык. Акадэмік АН БССР з 1969 г. (член-карэспандэнт з 1957 г.), доктар філалагічных навук (1956), прафесар (1956). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1974). Лаурэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа (1980). Член СП СССР з 1937 г.

В.В. Барысéнка нарадзіўся 25 красавіка 1904 г. у г. Барысаў Мінскай губерні ў сям'і чыгуначніка. Да 1924 г. жыў разам з бацькамі, працаваў на чыгунцы і адначасова вучыўся ў вячэрняй школе. У 1921 г. паступіў у Барысаўскі педагагічны тэхнікум і ў 1924 г. закончыў яго. У 1924 – 1926 гг. працаваў настаўнікам у пачатковай сельскай школе. У 1926–1932 гг. вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у аспірантуры пры кафедры беларускай літаратуры АН БССР. Пасля заканчэння аспірантуры быў дэканам літаратурнага факультэта, дацэнтам на кафедры беларускай літаратуры Мінскага педагагічнага інстытута (1932–1934), у 1934–1937 з'яўлялся старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута мовы і літаратуры АН БССР .

В 1937–1941 гг. В.В. Барысенка працаваў на пасадзе дырэктара Інстытута мовы і літаратуры АН БССР і па сумяшчальніцтву дацэнтам педінстытута.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны быў у дзеючай арміі (Заходні, Стэпавы, 2-гі Украінскі, Беларускі франты) у якасці спецыяльнага карэспандэнта армейскай газеты. Пасля дэмабілізацыі з 1946 па 1974 гг. працаваў дырэктарам Інстытута літаратуры АН БССР і па сумяшчальніцтву да 1960 г. дацэнтам, затым прафесарам Мінскага педінстытута. У 1974–1984 гг. – навуковы супрацоўнік-кансультант Інстытута літаратуры АН БССР.

Выступаць у друку В.В. Барысенка пачаў з 1932 г. У 1937 г. ён быў прыняты ў члены Саюза пісьменнікаў СССР. В.В. Барысенка даследаваў праблемы тэорыі і гісторыі беларускай літаратуры, тэксталогіі. Яшчэ ў даваенны час сфарміраваліся асноўныя рысы творчага аблічча В.В. Барысенкі як вучонага-літаратара. У яго навуковых інтарэсах удала спалучаліся глыбокая зацікаўленасць гісторыяй літаратуры і крытычны азарт вывучэння сучаснага літаратурнага працэсу. Яго асаблівай увагай карысталася творчасць народных паэтаў Беларусі Я. Купалы і Я. Коласа. У пасляваенныя гады вучоны працягваў вывучэнне спадчыны буйнейшых беларускіх пісьменнікаў. Яго пяру належаць друкаваныя працы, прысвечаныя творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, З. Бядулі, П.Труса, Цёткі.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

В.В. Барысенка шмат увагі надаваў практычным патрэбам вышэйшай і сярэдняй школы. З яго дапамогай, пад яго непасрэдным кіраўніцтвам і пры асабістым аўтарскім удзеле былі складзены праграмы, створаны хрэстаматыі, напісаны падручнікі па беларускай літаратуры для сярэдняй школы і педагагічных вучылішчаў. Ён – адзін з аўтараў падручніка і хрэстаматыі “Беларуская літаратура” для 8 класа (1959—1978, 19 выданняў), складальнік хрэстаматыі “Беларуская літаратура: дакастрычніцкі перыяд” для педагагічных вучылішчаў (1953), падручніка для 10 класа «Родная літаратура» (1961), зборнікаў “Беларуская дакастрычніцкая проза” (1965), “Беларуская дакастрычніцкая паэзія” (1967).

В.В. Барысенка быў ініцыятарам напісання і адным з рэдактараў двухтомнай “Гісторыі беларускай савецкай літаратуры” (1964–1966), двухтомнай “Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры” (1968–1969), “Нарысаў па гісторыі беларускай літаратуры” (1956).

В. В. Барысенка ўваходзіў у склад рэдакцыйных саветаў і калегій многіх літаратурных і навуковых выданняў у Мінску і Маскве.

За ўдзел у 2-томным даследаванні “История белорусской дооктябрьской литературы” і “История белорусской советской литературы” (1977) В.В. Барысенку была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Я. Коласа (1980).

Васіль Васільевіч Барысенка ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені (1944), Чырвонай Зоркі (1944, 1945), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1949), медалямі.

Памёр В.В. Барысенка 26 ліпеня 1984 г.

*Літаратура:*
*Национальная академия наук Беларуси : персональный состав, 1928–2015 / сост.: Т.С. Буденкова [и др.] ; редсовет: В.Г. Гусаков (пред.) [и др.]. – 2-е изд., испр. – Минск : Беларуская навука, 2016. – С. 42 – 43.*
*Беларускія пісьменнікі : біябібліяграф. слоўнік : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Беларусі ; Беларус. энцыкл. ; Рэдкал.: І.Э. Багдановіч і інш. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі. – Т. 1 : Абуховіч-Ватацы. – 1992. – С.255 – 257.*
*ЦНБ НАН Беларусі. ЦДСР. – Фонд 77. – Воп. 1. – Адз. зах. 57.*

Навуковы супрацоўнік Т.І. Жук

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

**ДАВЕДКА**
**аб складзе фонду № 77**
**“Барысенка Васіль Васільевіч”**

Матэрыялы асабістага архіва беларускага літаратуразнаўцы, крытыка, акадэміка НАН Беларусі Васіля Васільевіча Барысенкі паступілі ў ЦНБ НАН Беларусі у канцы 1980-х гг. Разам з дакументамі архіва ў бібліятэку былі перададзены ордэны і медалі В.В. Барысенкі. Для іх уліку складзены асобны спіс, які далучаны да вопісу фонду.

Пасля навукова-тэхнічнай апрацоўкі фонд налічвае 59 адзінак захавання за 1944–1984 гг. і складаецца з наступных асноўных груп дакументаў:

1. Творчыя документы. У гэту групу ўвайшлі тры тамы дысертацыі В.В. Барысенкі на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук “Ф. Богушевич и проблема реализма в белорусской литературе XIX века”.

2. Документы службовай дзейнасці прадстаўлены стэнаграмамі розных пасяджэнняў, дасланыя В.В. Барысенку ў Інстытут літаратуты імя Я. Купалы АН БССР.

3. У раздзел дакументаў да біяграфіі В.В. Барысенкі ўвайшлі матэрыялы аб святкаванні юбілеяў, дыпломы аб прысуджэнні вучоных ступеняў, пасведчанні члена-карэспандэнта і акадэміка АН БССР, пасведчанне ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны, ордэнская кніжка і пасведчанні да медалёў, ганаровыя граматы і іншыя матэрыялы.

4. Выяўленчыя дакументы прадстаўлены фатаграфіямі В.В. Барысенкі індывідуальнай і ў группе з таварышамі па службе, з супрацоўнікамі Інстытута літаратуры імя Я. Купалы, фотаздымкамі святкавання 80-годдзя з дня яго нараджэння.

5. У раздзел дакументаў пра фондаўтваральніка ўвайшлі артыкулы пра яго жыццё і творчую дзейнасць і верш М. Арочкі, прасвечаны В.В. Барысенку.

Навуковы супрацоўнік Т.І. Жук

лістапад 2024 г.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Дзяржаўная ўстанова “Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”
Фонд №___
Вопіс №___

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар дзяржаўнай установы “Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”
______________________________
___________________20_______

| № п/п | Загаловак справы | Дата (крайнія даты) справы | Коль-касць арку-шаў | Заўвага |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| | **1. Творчыя дакументы В.В. Барысенкі (1954)** | | | |
| | 1.1. Дысертацыя “Ф. Богушевич и проблема реализма в белорусской литературе XIX века” (1954) | | | |
| 1. | “Ф. Богушевич и проблема реализма в белорусской литературе XIX века”. Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Том I. Машынапіс, на рускай мове. | 1954 | 448 +1а | |
| 2. | “Ф. Богушевич и проблема реализма в белорусской литературе XIX века”. Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Том II. Машынапіс, на рускай мове. | 1954 | 396 | |
| 3. | “Ф. Богушевич и проблема реализма в белорусской литературе XIX века”. Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Том III. Дадатак. Машынапіс, на рускай мове. | 1954 | 347+1а | |
| | **2. Дакументы службовага характару (1949)** | | | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4. | Стэнаграма пасяджэння, прысвечанага абмеркаванню даклада доктара філалагічных навук прафесара Г.П. Сердзючэнкі “О творческом наследии Н.Я. Марра” у Інстытыце мовы і мыслення імя М.Я Мара АН СССР (Маскоўскае аддзяленне). Пасяджэнне першае. Машынапіс, на рускай мове. | 8 лютага 1949 | 88 | |
| 5. | Стэнаграма пасяджэння, прысвечанага абмеркаванню даклада доктара філалагічных навук прафесара Г.П. Сердзючэнкі “О творческом наследии Н.Я. Марра” у Інстытыце мовы і мыслення імя М.Я Мара АН СССР (Маскоўскае аддзяленне). Пасяджэнне другое. У тэксце – рукапісныя праўкі неўстаноўленай асобы. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 10 лютага 1949 | 101 | |
| 6. | Стэнаграма пашыранага пасяджэння Вучонага Савета Інстытута рускай мовы і Маскоўскага аддзялення Інстытута мовы і мыслення імя М.Я. Мара АН СССР, прысвечанага абмеркаванню артыкула “За передовое советское языкознание”, апублікаванага ў газеце “Культура и жизнь” 11 мая 1949 г.; рэзалюцыя пасяджэння і суправаджальнае пісьмо вучонага сакратара Савета да В.В. Барысенкі. Машынапіс, на рускай мове. | 27 мая, 9 ліпеня 1949 | 107 | |
| 7. | Стэнаграма пашыранага пасяджэння Вучонага Савета Інстытута рускай мовы і Маскоўскага аддзялення Інстытута мовы і мыслення імя М.Я. Мара АН СССР, прысвечанага абмеркаванню артыкула “За передовое советское языкознание”, апублікаванага ў газеце “Культура и жизнь” 11 мая 1949 г. [Пасяджэнне другое]. Машынапіс, на рускай мове. | 28 мая 1949 | 116 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **3. Дакументы да біяграфіі В.В. Барысенкі (1945–1984)** | | | |
| | 3.1. Дакументы аб святкаванні юбілеяў (1964–1984) | | | |
| | 3.1.1. 60-годдзе з дня нараджэння | | | |
| 8. | Віншавальныя пісьмы Прэзідыума АН БССР, Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР, супрацоўнікаў Літаратурнага музея Янкі Купалы з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Машынапіс, рукапіс, на беларускай, рускай мовах. | 18–25 красавіка 1964 | 3 | |
| 9. | Віншавальны адрас Прэзідыума АН БССР і Аддзялення грамадскіх навук АН БССР з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння і 35-годдзя навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці В.В. Барысенкі. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка 1964] | 2 | |
| 10. | Віншавальныя адрасы супрацоўнікаў Інстытута літаратуры імя Я. Купалы, Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа, Інстытута мастацвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Рукапіс, машынапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка 1964] | 6 | |
| 11. | Віншавальныя адрасы супрацоўнікаў Інстытута гісторыі і Інстытута філасофіі АН БССР з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння і 35-годдзя навукова-педагагічнай і грамадскай дзейнасці В.В. Барысенкі. Рукапіс, машынапіс, на рускай мове. | [25 красавіка 1964] | 4 | |
| 12. | Віншавальны адрас Праўлення Саюза пісьменнікаў БССР і беларускіх літаратараў з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Рукапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка 1964] | 2 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 13. | Віншавальныя адрасы калектыву супрацоўнікаў і студэнтаў Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага і кафедры беларускай літаратуры з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Рукапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка 1964] | 4 | |
| 14. | Віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Навукова-даследчага інстытута педагогікі БССР з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Рукапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка 1964] | 2 | |
| | 3.1.2. 70 і 75-годдзе з дня нараджэння (1974, 1979) | | | |
| 15. | Віншавальныя пісьмы, паштоўкі і тэлеграмы розных асоб і ўстаноў з нагоды 70 і 75-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Рукапіс, машынапіс, друк, на рускай, беларускай мовах. | [11 красавіка 1974 – 26 красавіка 1979] | 37 | |
| 16. | Віншавальны адрас дырэкцыі і калектыву супрацоўнікаў Мінскай вышэйшай партыйнай школы з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | 25 красавіка 1974 | 2 | |
| 17. | Віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. (На папцы – металічная накладка з выгравіраваным надпісам). Рукапіс, на беларускай мове. | 25 красавіка 1974 | 3 | |
| 18. | Віншавальныя адрасы калектыву супрацоўнікаў кафедр беларускай, рускай і замежннай літаратуры і студэнтаў Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Машынапіс, рукапіс, на беларускай, рускай мовах. | 25 красавіка 1974 | 5 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 19. | Віншавальныя адрасы Аддзялення грамадскіх навук і калектыву супрацоўнікаў Інстытута літатратуры імя Я Купалы АН БССР з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння і 45-годдзя навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці В.В. Барысенкі. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | [25 красаві-ка] 1974 | 4 | |
| 20. | Віншавальныя адрасы калектыву супрацоўнікаў Інстытута філасофіі і права і Інстытута эканомікі АН БССР з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння і 45-годдзя навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці В.В. Барысенкі. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | [25 красаві-ка] 1974 | 5 | |
| 21. | Віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Інстытута гісторыі АН БССР з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння і 45-годдзя навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці В.В. Барысенкі. (На папцы – металічная накладка з выгравіраваным надпісам). Рукапіс, на рускай мове. | [25 красавіка 1974] | 3 | |
| 22. | Віншавальны адрас беларускіх пісьменнікаў з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка 1974] | 2 | |
| 23. | Віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Аддзела навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках АН БССР з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. (На папцы – металічная накладка з выгравіраваным надпісам). Рукапіс, на рускай мове. | [25 красавіка 1974] | 3 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 24. | Віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Рукапіс, машынапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка 1974] | 3 | |
| 25. | Віншавальныя адрасы выкладчыкаў і супрацоўнікаў філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта і рэктарата і супрацоўнікаў кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Друк, машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка 1974] | 4 | |
| 26. | Віншавальны адрас Праўлення Саюза пісьменнікаў СССР і Савета па беларускай літаратуре з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Машынапіс, на рускай мове. | [красавік 1974] | 2 | |
| 27. | Віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Навукова-даследчага інстытута педагогікі БССР з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі і прысуджэння яму ганаровага звання “Заслужаны дзеяч навукі БССР”. (На папцы – металічная накладка з выгравіраваным надпісам). Друк, рукапіс, на беларускай мове. | [красавік 1974] | 3 | |
| 28. | Віншавальны адрас Аддзялення грамадскіх навук АН БССР з нагоды 75-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Друк, на беларускай мове. | [красавік] 1979 | 2 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 3.1.3. 80-годдзе з дня нараджэння (1984) | | | |
| 29. | Віншавальныя пісьмы, паштоўкі і тэлеграмы розных асоб і ўстаноў з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Рукапіс, машынапіс, друк, на рускай, беларускай мовах. | 10–25 красавіка 1984 | 25 | |
| 30. | Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб ўзнагароджанні В.В. Барысенкі Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР у сувязі з 80-годдзем з дня яго нараджэння. Газета “Звязда” за 25 красавіка 1984 г. Друк, на беларускай мове. | 25 красавіка 1984 | 2 | |
| 31. | Віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. (На папцы – металічная накладка з выгравіраваным надпісам). Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | 25 красавіка 1984 | 3 | |
| 32. | Віншавальныя адрасы калектыву выкладчыкаў і студэнтаў філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, супрацоўнікаў кафедры беларускай літаратуры і філалагічнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | 25 красавіка 1984 | 4 | |
| 33. | Віншавальны адрас Аддзялення грамадскіх навук АН БССР з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка] 1984 | 2 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 34. | Віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Інстытута філасофіі і права АН БССР з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Рукапіс, на рускай мове. | [25 красаві-ка] 1984 | 2 | |
| 35. | Віншавальны адрас дырэкцыі і калектыву супрацоўнікаў Інстытута літаратуры імя Я. Купалы з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. (Адрас – у драўляным футляры інкруставаным саломкай з віншавальным надпісам). Машынапіс, рукапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка 1984] | 2 | |
| 36. | Віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Аддзела навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках АН БССР з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | [25 красавіка 1984] | 2 | |
| 37. | Віншавальны адрас беларускіх пісьменнікаў з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка 1984] | 2 | |
| 38. | Віншавальны адрас калектыву супрацоўнікаў Навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі. Рукапіс, на беларускай мове. | [25 красавіка 1984] | 2 | |
| | 3.2. Іншыя дакументы да біяграфіі (1945–1984) | | | |
| 39. | Ордэнская кніжка і пасведчанні да медалёў В.В. Барысенкі. Друк, рукапіс, на рускай мове. | 5 верасня 1945–15 чэрвеня 1984 | 27 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 40. | Дыпломы аб прысуджэнні В.В. Барысенку вучоных ступеней кандыдата і доктара філалагічных навук, атэстат дацэнта і старшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці “белорусская литература”. Друк, рукапіс, на рускай мове. | 4, 6 сакавіка 1946; 1 сакавіка 1956 | 12 | |
| 41. | Дакументы (пасведчанні члена-карэспандэнта і акадэміка АН БССР, ваенны білет, членскі білет Саюза пісьменнікаў СССР, пасведчанне ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны і інш.) біяграфічнага характару. На асобных дакументах ёсць фатаграфіі В.В. Барысенкі. Друк, рукапіс, на рускай, беларускай мовах. | 12 кастрычніка 1948 – 27 жніўня 1980 | 49 | |
| 42. | Пасведчанне аб шлюбе В.В. Барысенкі з Г.І. Іскрыцкай, пасведчанне аб смерці Г.І. Барысенка (Г.І. Іскрыцкай). Рукапіс, друк, на рускай, беларускай мовах. | 10 снежня 1952; 21 верасня 1970 | 3 | |
| 43. | Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР, выдадзеная В.В. Барысенку ў сувязі з Дэкадай беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | 21 сакавіка 1955 | 3 | |
| 44. | Пасведчанне аб абранні В.В. Барысенкі членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР па Аддзяленні грамадскіх навук. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | 30 сакавіка 1957 | 1 | |
| 45. | Пісьмо А. Макарэвіча да В.В. Барысенкі. Рукапіс, на беларускай мове. | 17 лістапада 1962 | 1 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 46. | Ганаровыя граматы Прэзідыума, парткама і групкама АН БССР і Савецкага райкама КПБ, выдадзеныя В.В. Барысенку за высокія вытворчыя паказчыкі і актыўны ўдзел у грамадскай працы, з нагоды дзяржаўных свят і інш. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | [лістапад 1967], 23 снежня 1968 і б/д | 3 | |
| 47. | Ганаровая грамата Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку і Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры, выдадзеная В.В. Барысенку (члену рэдкалегіі часопіса “Полымя”) за шматгадовае супрацоўніцтва з часопісам і ў сувязі з выхадам яго 500-га нумара. Машынапіс, друк, на беларускай мове. | 1970 | 3 | |
| 48. | Ганаровая грамата Цэнтральнага камітэта ЛКСМ Беларусі, выдадзеная В.В. Барысенку ў сувязі з 50-годдзем Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі. Друк, машынапіс, на беларускай мове. | 1970 | 2 | |
| 49. | Віншавальныя тэлеграмы розных асоб з нагоды прысваення В.В. Барысенку ганаровага звання “Заслужаны дзеяч навукі БССР”. Машынапіс, на рускай, беларускай мовах. | [15, 16 красавіка 1974] | 3 | |
| 50. | Ганаровая грамата Міністэрства асветы Беларускай ССР, выдадзеная В.В. Барысенку за актыўны ўдзел у стварэнні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для сярэдняй агульнаадукацыйнай школы і ў сувязі з 70-годдзем з дня яго нараджэння. Дадатак: загад Міністра асветы Беларускай ССР аб узнагароджанні В.В. Барысенкі Ганаровай граматай. Машынапіс, на беларускай мове. | 25 красавіка 1974 | 4 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 51. | Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, выдадзеная В.В. Барысенку ў сувязі з 60-годдзем БССР і Камуністычнай партыі Беларусі. Друк, рукапіс, на беларускай мове. | 15 снежня 1978 | 3 | |
| 52. | Падзяка Беларускай рэспубліканскай камісіі садзейнічання Савецкаму фонду міру за актыўны ўдзел В.В. Барысенкі ў рабоце згаданага фонду. Друк, рукапіс, на рускай мове. | 1 кастрычніка 1981 | 2 | |
| | **4. Выяўленчыя дакументы ([1944] –1970 і б/д)** | | | |
| 53. | Фатаграфіі В.В. Барысенкі індывідуальная і ў групе з таварышамі па службе ў гады Вялікай Айчыннай вайны. | б/д [1944 – 1945?] | 3 | |
| 54. | Фатаграфіі В.В. Барысенкі ў групе з супрацоўнікамі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. | [1950-я – 1960-я гг.], 1970 | 3 | |
| 55. | Фатаграфіі, зробленыя падчас святкавання 80-годдзя з дня нараджэння В.В. Барысенкі ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. | [красавік 1984] | 9 | |
| | **5. Дакументы пра В.В. Барысенку (1974–1984)** | | | |
| 56. | М. Арочка. "Акраверш В.В. Барысенку". Рукапіс, на беларускай мове. | 23 красавіка 1974 | 1 | |
| 57. | В.А. Каваленка. Артыкул "Старэйшына беларускага літаратуразнаўства і крытыкі. (Да 75-годдзя з дня нараджэння акадэміка АН БССР В.В. Барысенкі)". Асобны адбітак з часопіса "Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук", № 2 за 1979 г. 2 экз. Друк, на беларускай мове. | 1979 | 6 | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 58. | А.М. Адамовіч, В.А. Каваленка. Артыкул “Вучоны і настаўнік. (Да 80-годдзя з дня нараджэння акадэміка АН БССР В.В. Барысенкі)”. Часопіс “Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук”, № 2 за 1984 г., стар.112–113. Друк, на беларускай мове. | 1984 | 128 стар. | |
| 59. | “Васіль Васільевіч Барысенка”. Некралог з нагоды смерці В.В. Барысенкі. Часопіс “Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук”, № 5 за 1984 г., і асобныя адбіткі некралога з вышэйзгаданага часопіса. Друк, на беларускай мове. | 1984 | 137 стар. | |

У дадзены вопіс унесена **59** ***(пяцьдзясят дзевяць)*** спраў
з № **1** па № **59,** у тым ліку:
літарныя нумары: -
прапушчаныя нумары: -

Навуковы супрацоўнік аддзела даследавання рукапісаў — Т.І. Жук

Загадчык аддзела даследавання рукапісаў — В.В.Урублеўскі

Загадчык Цэнтра даследавання старадрукаў і рукапісаў — К.В. Сыцько

«____»__________2024 г.

УЗГОДНЕНА
Пратакол ФК № ____ ад ___________



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

ЦЭНТРАЛЬНАЯ НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Я. КОЛАСА

ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ СТАРАДРУКАЎ І РУКАПІСАЎ

АДДЗЕЛ ДАСЛЕДАВАННЯ РУКАПІСАЎ

# «БАРЫСЕНКА ВАСІЛЬ ВАСІЛЬЕВІЧ »

## ФОНД № 77

## ВОПІС № 1

## СПІС МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# ФОНД № 77

| № п/п | Інвен-тарны № | Назва, кароткае апісанне прадмета | Дата стварэння | Апісанне знешніх асаблівасцяў, ступень захаванасці | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1. | | Ордэн Айчыннай вайны II ступені. № 78296. | | | |
| 2. | | Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. № 75215. | | | |
| 3. | | Ордэн Чырвонай Зоркі. № 642222. | | | |
| 4. | | Ордэн Чырвонай Зоркі. № 1451251. | | | |
| 5. | | Медаль “За баявыя заслугі”. № 398687. | | | |
| 6. | | Медаль “За абарону Масквы”. | | | |
| 7. | | Медаль “За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.”. | | | |
| 8. | | Медаль “За ўзяцце Берліна”. | | | |
| 9. | | Медаль “За вызваленне Варшавы”. | | | |
| 10. | | Медаль “Дваццаць гадоў перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.”. | | | |
| 11. | | Медаль “50 гадоў Узброеных Сіл СССР”. | | | |
| 12. | | Медаль “За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна”. | | | |
| 13. | | Медаль “60 гадоў Узброеных Сіл СССР”. | | | |
| 14. | | Медаль “Ветэран працы”. | | | |
| 15. | | Ордэнскія планкі ў колькасці васьмі штук. | | | |



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# ЛІСТ-ЗАВЯРАЛЬНІК ВОПІСУ № 1 (Ф. № 77)

У дадзеным вопісу пранумеравана ***14 (чатырнаццаць)*** аркушоў + ***I –V*** аркушоў уводнай часткі, у тым ліку:

літарныя нумары: ______________________________

прапушчаныя нумары: ______________________________

| Асаблівасці фізічнага стану і фарміравання вопісу | Нумары аркушоў вопісу |
|---|---|
| 1 | 2 |
| Да вопісу прылучана ўводная частка (змест, схема сістэматызацыі,даведка аб фондаўтваральніку і складзе фонду).<br>Да вопісу прылучаны спіс музейных прадметаў (ордэны і медалі фондаўтваральніка), якія паступілі ў складзе асабістага фонда. | I–V |

Навуковы супрацоўнік Т.І. Жук

01.10.2024

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by